## № 76. Язэпу Пушчу

*13 сьнежня 1934 г.*
*г. Киров, Ст. Халтурина, 85, кв.1.*

Дарагі браце Язэп!

Як бачыш, гэтую лістоўку пішу з новага месца. Тут жыву з 1 сьнежня. Сям'я 'шчэ на старым месьце. Астаноўка ў пераезьдзе за кватэраю. Як толькі знойдзецца, дык пераедзе і сям'я сюды. Слабажан усіх перакінулі сюды, застаўся толькі Міхась Маркевіч, злажыўшы косьці свае на слабадзкім могільніку. Таксама перакінулі сюды і з іншых месц. Да слова кажучы, гэтыя падзеі былі прычынаю, што я дасюль не паслаў карткі. То ж ня ўпэўнен быў я, ці на тым самым жа месьце жывеш. Уладзік паехаў у Чэбаксары. Ад яго даўно не было лістоў. Ня ведаю, як ён маецца цяпер. Працаваў ён усё над перакладам „Чайльд Гарольда". Пішы, Язэпе, як жывеш сам, як маюцца твае дачушкі. Мае часта іх успамінаюць. Ці пішаш што? Мо' скончыў „Сады вятроў"? Як бы хацелася пачытаць тваё мастацкае слова. Прымі прывітаньне ад Антося. Мы з ім жывем разам. Прывітаньне Стасі з дзеткамі. Цалую цябе.

Твой *Адам*.

## № 77. Ганьне Бабарэцы

*15.XII.1934 г.*

Дарагая Анечка!

Чакаў твайго ліста і не дачакаўся. Атрымаў толькі лістоўку, а ў лістоўцы ты пра сябе амаль нічога і ня пішаш. Ты нічога не паведаміла пра сваё здароўе, ці суняліся болі жывата, ці яшчэ адчуваюцца. Трэба, каб ты абавязкова схадзіла да доктара і параілася з ім наконт гэтых прыступаў болі, што гэта за хвароба. Ці не апэндыцыт гэта? Абавязкова схадзі да доктара. Апэндыцыт таксама аказваецца прыступамі і пры трэйцім і чацьвертым прыступах бываюць сьмяротнымі. Дык вось, хоць на першы погляд і нясур'ёзная хвароба, але канец бывае вельмі сумны. Каб ты мне абавязкова схадзіла і выявіла сваю хваробу. Са мною на працы такую штуку зрабілі. Як пісаў я табе, дакляравалі 280 р., а цяпер хацелі пасадзіць на 200, потым аддалі загад па старой стаўцы 225. Я сказаў гл[аўнаму] бух[гальтару], што я на такіх умовах болей не работнік у іх. Думаю паставіць пытаньне цьвёрда і кінуць гэтую работу, калі ня будзе ніякіх пэрспэктыў палепшаньня умоў. Дакляравалі і з кватэрай дапамагчы, а дайшло да справы, дык выйшла, што ўсё гэта было адна балбатня.

Пішы, Аня, і падрабязьней, пра сябе і дзяцей. Ці цёпла ў вас у хаце? Цалую Вас моцна ўсіх. Чакаю адказу ад Лоры і Лялі.

Ваш *Адам*!